# 5 снежня — Дзень Савецкай Канстытуцыі

Як вялікае свята, адзначаецца гэты дзень па ўсёй нашай краіне. Ва універсітэце з лекцыямі, дакладамі, гутаркамі ў групах і на курсах выступаюць выкладчыкі і члены студэнцкіх лектарскіх груп. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці падрыхтавалі новыя канцэртныя праграмы. У госці да падшэфных выязджаюць факультэцкія агітбрыгады.




ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (764) • Серада, 3 снежня • Цана 2 кап. • Год выдання XXIII


На гістарычным факультэце абмеркаван ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна і падведзены вынікі спаборніцтва на званне лепшых.

Сёння мы змяшчаем матэрыялы з гістарычнага факультэта, падрыхтаваныя рэдкалегіяй насценгазеты «Гісторык».

## ДА 100-ГОДДЗЯ ПРАВАДЫРА

Нядаўна на сходзе партгруп выкладчыкаў і на вучоным савеце гістарычнага факультэта быў абмеркаваны ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў, узятых да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Адзначана, што паспяхова трымае слова калектыў самай вялікай на гістфаку кафедры — гісторыі СССР. Тут большасць юбілейных планаў ужо выканана. Члены кафедры плённа працуюць па ленінскай тэматыцы. Так, А. І. Кажушкоў падрыхтаваў спецкурс «Здзяйсненне ленінскага плана культурнай рэвалюцыі ў СССР», В. І. Сідарцоў — «Ленін і развіццё Савецкай Канстытуцыі», М. Б. Фрыдман — «У. І. Ленін аб рэвалюцыйным руху ў Расіі ў XIX ст. (спецсемінар).

Распрацаваны лекцыі, тэмы якіх звязаны з дзейнасцю У. І. Леніна як кіраўніка і настаўніка нашага народа, заснавальніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, гісторыка. Гэта — «У. І. Ленін аб сацыяльнай сутнасці выхавацеля і аб удзеле моладзі ў грамадскім жыцці», «У. І. Ленін — ініцыятар утварэння БССР» і іншыя. Выканалі свае асабістыя абавязацельствы, закончыўшы работу над кандыдацкімі дысертацыямі, Я. Т. Навуменка, Ю. І. Драгун, Ф. І. Адашчык.

## ЛЕПШЫЯ ВЫЗНАЧАНЫ

Падведзены вынікі грамадскага агляду на званне лепшай кафедры, лепшага выкладчыка і лепшай акадэмічнай групы гістарычнага факультэта. Камісія ў саставе П. З. Савачкіна (старшыня), Н. А. Гусаковай, Э. М. Загарульскага, Д. С. Клімоўскага і В. І. Цітка прызнала лепшай кафедрай факультэта кафедру гісторыі БССР, калектыў якой вызначае пачуццё новага, імкненне да ўдасканалення навучальнага працэсу, высокая грамадская актыўнасць і навуковая прадуктыўнасць.

Лепшым выкладчыкам названа Марыя Парфіраўна Баранава, дацэнт кафедры гісторыі СССР. Больш 25 год гучыць яе голас у аўдыторыях універсітэта. Любоў да сваёй справы, асабліва ўважлівыя адносіны да студэнта, прываблівая чуласць і цвёрдасць у прынцыповых пытаннях побач з развітым пачуццём доўгу і грамадскай адказнасці — такой ведаюць Марыю Парфіраўну студэнты і выкладчыкі.

Лепшай акадэмічнай групай прызнана група IV курса аддзялення філасофіі. Дарэчы, яна лепшая па паспяховасці і ва універсітэце.

## ПАСТАНОВА

### ПЛЕНУМА ЦК ЛКСМ БЕЛАРУСІ АБ СКЛІКАННІ ЧАРГОВАГА XXIV З'ЕЗДА ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

I. Склікаць чарговы XXIV з'езд Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі 26—27 лютага 1970 года.

II. Зацвердзіць наступны парадак работы з'езда:
Справаздачны даклад Рэвізійнай камісіі ЛКСМ Беларусі. Дакладчык старшыня Рэвізійнай камісіі тав. Ганчарык В. І.
Выбары цэнтральных органаў Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі.

III. Выбары дэлегатаў на XXIV з'езд ЛКСМ Беларусі правесці на абласных камсамольскіх канферэнцыях па норме прадстаўніцтва — адзін дэлегат ад 1500 членаў ВЛКСМ, якія знаходзяцца на ўліку ў абласной камсамольскай арганізацыі.

Члены ВЛКСМ, якія знаходзяцца на ўліку ў камсамольскіх арганізацыях Савецкай Арміі, пагранічных і іншых часцях, выбіраюць дэлегатаў на XXIV з'езд камсамола Беларусі разам з астатнімі камсамольскімі арганізацыямі на абласных камсамольскіх канферэнцыях.



*В'етнамскія студэнты БДУ з вялікай цікавасцю знаёмяцца з жыццём савецкіх дзяцей, наведваюць школы, дзіцячыя сады, палацы піянераў. Беларускія хлопчыкі і дзяўчынкі заўсёды шчыра сустракаюць маладых прадстаўнікоў гераічнага В'етнама.*

*НА ЗДЫМКУ: в'етнамскія студэнты ў Мінскім палацы піянераў.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*

## ЛЕНІНСКІХ ІДЭЙ ПЕРАМОЖНАЕ ШЭСЦЕ

У актавай зале універсітэта адбылася рэспубліканская інтэрнацыянальная студэнцкая навукова-тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Уступным словам яе адкрыў намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. І. Красоўскі. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел савецкія і замежныя студэнты з краін Азіі, Афрыкі, Еўропы і Лацінскай Амерыкі, якія навучаюцца ў БДУ, Інстытуце народнай гаспадаркі, БПІ, педагагічным інстытуце замежных моў, медыцынскім, тэхналагічным інстытутах, Беларускай сельгасакадэміі і іншых навучальных установах рэспублікі.

З дакладамі на канферэнцыі выступілі 13 прадстаўнікоў розных краін. Навуковымі кіраўнікамі іх былі дацэнты БДУ І. Г. Родзін, К. К. Герман, Д. Б. Мельцар, Г. С. Маханёк, дацэнты БПІ І. М. Ступнікаў, кандыдат юрыдычных навук А. П. Кудраўцаў, дацэнт БСГА В. Г. Лук'янаў і іншыя.

З вялікай цікавасцю праслухалі прысутныя даклады аспіранта універсітэта Нгуен Ван Тхоа «У. І. Ленін і рэвалюцыя ў В'етнаме», студэнткі 5-га курса гістфака універсітэта Г. Сцяпанавай «У. І. Ленін і стварэнне Камуністычнага Інтэрнацыянала Моладзі», студэнта 3-га курса фізфака універсітэта афганца Мухамеда Якуба Амоні «У. І. Ленін аб ролі народных мас у працэсе гістарычнага развіцця», студэнта 5-га курса політэхнічнага інстытута Ампонса Самсона «Сацыяльна-эканамічныя праблемы развіваючыхся краін Афрыкі», студэнта 4-га курса факультэта механізацыі сельскай гаспадаркі БСГА Гурунга Махана «У. І. Ленін і аграрна-сялянскае пытанне (па матэрыялах Непала)», студэнта 3-га курса аўтатрактарнага факультэта БПІ венгра Немета Мартона «Ленінская крытыка ідэі беспартыйнасці».

Змястоўнымі былі таксама даклады студэнта універсітэта А. Разанава «Ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі», аспіранта універсітэта Джона Флетчара «Ленінскае вучэнне аб культурнай рэвалюцыі і яго значэнне для Афрыкі», студэнта політэхнічнага інстытута балгарына Русі Русева Герцова «Савет Эканамічнай Узаемадапамогі і эканамічнае развіццё Балгарыі» і непальца Лала Карна «У. І. Ленін аб класавай сутнасці буржуазнай і сацыялістычнай дэмакратыі» і іншыя.

У заключэнне ленінскай канферэнцыі дакладчыкам былі ўручаны памятныя падарункі.

Ул. СЯРГЕЕЎ.

# БЫЦЬ НАПЕРАДЗЕ —

## МАТЭРЫЯЛЫ З ДАКЛАДА САКРАТАРА ПАРТКОМА Т. Я. ДУДАРАВАЙ І

Галоўную ўвагу ў справаздачным перыядзе партком сканцэнтраваў на тым, каб падняць ролю партыйнай арганізацыі ў вырашэнні ўсіх задач, якія стаяць перад калектывам універсітэта, і перш за ўсё імкнуўся сумесна з партыйнымі бюро дабіцца паляпшэння работы пярвічных арганізацый і груп, прыцягнуць усіх камуністаў да актыўнай работы ў арганізацыі. Партком заслухаў на сваіх пасяджэннях партбюро факультэта журналістыкі, падрыхтоўчага факультэта, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, абмеркаваў работу партгрупы чацвёртага курса біяфака і аспіранцкай партгрупы. Каб больш дзейснай была дапамога пярвічным арганізацыям, партком рэгулярна праводзіў інструктаванні сакратароў і членаў партбюро, члены парткома прымалі ўдзел у факультэцкіх партыйных сходах. Пры парткоме быў арганізаваны пастаянна дзейнічаючы семінар сакратароў і намеснікаў сакратароў партбюро, партгрупоргаў. Праводзіліся нарады камсамольскага і прафсаюзнага актыву. Вялікую і шматгранную работу правялі пярвічныя арганізацыі фізічнага, геаграфічнага, хімічнага, гістарычнага, матэматычнага, падрыхтоўчага факультэтаў, ваеннай кафедры, АГЧ і г. д. У гэтым немалая заслуга сакратароў і членаў партыйных бюро.

Парткому даводзілася разглядаць і персанальныя справы камуністаў, якія скампраметавалі сябе недастойнымі паводзінамі. Некаторыя камуністы дапускалі недысцыплінаванасць ва ўплаце членскіх узносаў. Партком вымушаны быў абмяркоўваць пытанне аб стане ўплаты ўзносаў у партарганізацыях гістарычнага, юрыдычнага і факультэта журналістыкі.

Імкнучыся палепшыць арганізацыйна-партыйную работу, мы ўсё ж не здолелі пазбегнуць і сур'ёзных недахопаў. Часам нам не хапала аператыўнасці, дакладнасці, баявітасці, патрабавальнасці.

### ВУЧЭБНАЯ І НАВУКОВАЯ РАБОТА

У цэнтры ўвагі парткома, рэктарата, дэканатаў, кафедр і партыйных арганізацый знаходзілася галоўнейшае пытанне — паляпшэнне падрыхтоўкі спецыялістаў. На пасяджэннях парткома заслухоўваліся пытанні аб рабоце кафедры тэарэтычнай фізікі, праверана работа кафедры сістэматыкі раслін. На партыйных сходах матфака, фізфака, біяфака, юрфака, гістфака і іншых факультэтаў ставіліся пытанні аб ходзе выканання вучэбна-планавых праграм, аб падрыхтоўцы да летняй практыкі, да сесіі, аб паляпшэнні самастойнай работы студэнтаў.

Асаблівая ўвага была звернута на павышэнне навукова-тэарэтычнага ўзроўню выкладання: удасканальваліся вучэбныя планы і праграмы, быў перагледжаны змест лекцый і падручнікаў, створаны новыя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. У вучэбны працэс былі ўключаны новыя даныя, атрыманыя ў выніку навуковых даследаванняў.

Да адбору навуковай інфармацыі былі далучаны вядучыя вучоныя універсітэта, якія маюць вялікі стаж педагагічнай працы, і вядучыя работнікі вытворчасці. Вынікі адбору навуковай інфармацыі, адлюстраванай у праграмах, разглядаліся саветамі факультэтаў і метадычнымі камісіямі. Гэта дапамагала ўстанаўліваць пераемнасць дысцыплін, ліквідаваць паралелізм і дубліраванне. Павышэнню якасці вучэбнага працэсу садзейнічала паляпшэнне метадычнай дзейнасці кафедр, укараненне вылічальнай тэхнікі і матэматыкі як на прыродазнаўчых, так і на гуманітарных факультэтах, зроблена некаторая работа па ўкараненню навуковых асноў арганізацыі вучэбнага працэсу, працы выкладчыкаў і студэнтаў. Яна выявілася ў найбольш раўнамерным размеркаванні нагрузкі выкладчыкаў па семестрах і больш разумным размеркаванні часу па асноўных відах педагагічнай і навукова-даследчай работы, але пры абавязковай умове чытання асноўных лекцыйных курсаў вядучымі вучонымі, прафесарамі, дацэнтамі.

Вялікая ўвага ўдзялялася правільнай арганізацыі самастойнай працы студэнтаў і кантролю за ёй з боку кафедр. Пры навучанні студэнтаў па некаторых спецыяльнасцях выкарыстоўвалася найбольш сучаснае абсталяванне, пашырыліся магчымасці правядзення вытворчай практыкі на перадавых прамысловых прадпрыемствах.

Улічваючы, што якасць падрыхтоўкі спецыялістаў залежыць у многім ад узроўню выкладання, ад кваліфікацыі выкладчыкаў, іх навуковага і палітычнага росту, партком значную ўвагу ўдзяляў рабоце з выкладчыцкімі кадрамі. Як і раней, многія выкладчыкі павышаюць сваю кваліфікацыю праз дактарантуру і аспірантуру, паспяхова абараняюць доктарскія і кандыдацкія дысертацыі. Аб гэтым сведчаць наступныя даныя: у 1966 годзе ва універсітэце працавала 44 прафесары і дактары навук і 265 дацэнтаў і кандыдатаў, у 1969 годзе колькасць прафесараў і дактароў узрасла да 70, кандыдатаў і дацэнтаў — да 377. За тры апошнія гады прайшлі навучанне ў інстытутах і на факультэтах павышэння кваліфікацыі 97 выкладчыкаў універсітэта. Толькі за 10 месяцаў бягучага года абаранілі доктарскія дысертацыі 5 чалавек (І. І. Марціновіч, А. А. Лойка, І. Я. Навуменка, І. С. Цішкевіч, С. Г. Драбязка) і 37 — кандыдацкія.

У выніку прынятых мер у мінулым навучальным годзе асноўная маса студэнтаў справілася з вучэбнымі праграмамі, атрымала грунтоўныя веды, палепшылася наведванне заняткаў, амаль удвая скарацілася колькасць гадзін, прапушчаных без уважлівых прычын (з 74.368 гадзін да 37.871).

Аднак нас не можа поўнасцю задаволіць становішча паспяховасці ва універсітэце. Трывожыць той факт, што на 0,4 працэнта панізілася агульная паспяховасць, з 14 працэнтаў да 12,6 панізілася колькасць выдатных адзнак, а вось колькасць здавальняючых і нездавальняючых — павялічылася. Больш 40 працэнтаў студэнтаў паспяваюць толькі на здавальняюча, і яшчэ горшыя справы на вячэрніх аддзяленнях.

У мінулым навучальным годзе ва універсітэце працавала 21 дзяржаўная камісія. Аналіз абароны дыпломных работ і вынікаў дзяржаўных экзаменаў паказвае, што пераважная большасць студэнтаў паспяхова спраўляецца з універсітэцкай праграмай. Аднак некаторыя пры абароне дыпломных паказалі павярхоўныя веды. Выявілася, што асобныя дыпламанты-фізікі не маюць дастаткова глыбокіх ведаў нават у тых галінах, якія непасрэдна звязаны з дыпломнай работай. Асабліва гэта характэрна для выпускнікоў вячэрняга аддзялення. Нізкія вынікі дзяржэкзаменаў па методыцы выкладання фізікі. Тут 50 працэнтаў студэнтаў атрымалі здавальняючыя адзнакі. Быў выяўлены прабел у ведах выпускнікоў матэматычнага факультэта: недакладнасць фармуліровак асноўных палажэнняў і азначэнняў, дрэннае веданне асноўных раздзелаў вышэйшай матэматыкі: алгебры, матаналізу, тэорыі функцый і матэматычнай фізікі. Слабыя веды на дзяржэкзаменах паказалі студэнты вячэрняга аддзялення гістарычнага факультэта.

Толькі за апошнія пяць год ва універсітэце прыступіла да работы больш 400 маладых выкладчыкаў. Многія з іх недастаткова поўна валодаюць педагагічным майстэрствам, а дапамогі ім аказваецца мала. Некаторыя кафедры, дэканаты, вучоныя саветы на працягу семестра слаба займаюцца пытаннямі вучэбнай работы, а спахватваюцца толькі тады, калі недахопы выправіць ужо позна. Недастаткова вядзецца кантроль за якасцю чытання лекцый і правядзення практычных заняткаў. Часам выкладанне адказных курсаў даручаецца весці нявопытным выкладчыкам, у той час як многія прафесары і вядучыя выкладчыкі маюць нязначную лекцыйную нагрузку.

На факультэтах, кафедрах яшчэ мала праводзіцца метадычных нарад з выкладчыкамі, якія вядуць практычныя і семінарскія заняткі ў адной і той жа групе, з мэтай вывучэння студэнтаў, прыцягнення большай увагі да вучобы з боку студэнцкіх арганізацый.

Асобныя выкладчыкі на працягу семестра дапускаюць лібералізм: абыякава адносяцца да пропускаў заняткаў студэнтамі і дрэннай падрыхтоўкі іх да заняткаў.

Многія студэнты не хочуць сістэматычна працаваць. Аднак некаторыя групавыя камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі мала звяртаюць на гэта ўвагі. Пытаннямі вучобы слаба займаецца і камітэт камсамола універсітэта. На жаль, не адчуваецца належнай увагі да асноўнага абавязку студэнтаў і з боку партыйных студэнцкіх груп. Больш таго, нават самі камуністы аказваюцца ў ліку непаспяваючых.

З прычыны таго, што большасць непаспяваючых — гэта студэнты першых курсаў, мэтазгодна вызначыць пастаянныя метады і формы кантролю за цякучай паспяховасцю на працягу навучальнага года (дамашнія заданні, кантрольныя работы, субяседаванні па тэмах лекцыі з выстаўленнем адзнак і г. д.). Варта больш глыбока даследаваць умовы студэнцкай працы і быту, каб укараніць распарадак дня студэнтаў з навукова абгрунтаваным рэжымам вучобы, адпачынку, фізічнай культуры і спорту.

Адной з прычын, якія уплываюць на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, з'яўляецца тое, што вучэбныя планы ў многіх выпадках не адпавядаюць сучасным патрабаванням, а галоўнае — перспектыўным патрабаванням. У планах па спецыяльнасцях геаграфія, хімія, біялогія мала часу адводзіцца на вывучэнне матэматыкі, асноў праграміравання. Па спецыяльнасцях хімія, фізіка, матэматыка не чытаецца псіхалогія як прадмет. І пакуль што для ліквідацыі гэтых недахопаў прынятых мер аказалася недастаткова.

Двойчы абмяркоўвалася ў парткоме навукова-даследчая работа. Аб'ём яе ва універсітэце павялічваецца з кожным годам. Павышаецца эфектыўнасць навукова-даследчай работы. Праблемным лабараторыям была даручана распрацоўка васьмі новых тэм. План навуковых работ сёлетняга года выконваецца з перавышэннем. З пачатку гэтага года ў камітэт па вынаходствам пададзены 22 заяўкі. З 1966 года агульны аб'ём гаспадарча-дагаворных работ павялічыўся больш чым у 5 разоў і складзе ў 1969 годзе амаль 2 млн. рублёў. Даследаванні тут ідуць у розных напрамках: аўтаматызацыя вытворчасці, удасканаленне тэхналагічных працэсаў і метадаў кантролю, стварэнне прыбораў і апаратуры, рашэнне раду канкрэтных інжынерна-эканамічных задач і г. д.

У бягучым годзе на базе універсітэта было праведзена 10 навуковых і навукова-метадычных канферэнцый і сімпозіумаў. Некаторыя з іх былі прысвечаны ленінскай тэарэтычнай спадчыне.

Адчувальныя поспехі ў развіцці навукова-даследчай работы маюцца і на грамадскіх кафедрах, асабліва ў сувязі з падрыхтоўкай да Ленінскага юбілею. Супрацоўнікі гэтых кафедр падрыхтавалі і выдалі многа манаграфій, брашур, вучэбных дапаможнікаў.

Аднак у арганізацыі навукова-даследчай работы ёсць і шэраг сур'ёзных недахопаў. Гэта перш за ўсё драбнатэм'е, разрозненасць, малая колькасць комплексных тэм, якія б маглі яб'яднаць работу многіх кафедр і лабараторый. Навуковыя даследаванні часам вядуцца з выкарыстаннем маральна ўстарэўшага абсталявання і не маюць належнай эфектыўнасці. Нясвоечасова выконваюцца многія планы навуковых даследаванняў. Некаторыя тэмы пераносяцца з плана ў план.

На кафедрах не існуе патрэбнага кантролю за навуковай работай кожнага выкладчыка. Некаторыя з іх на працягу некалькіх гадоў фактычна навуковую работу не вядуць.

Па-ранейшаму на факультэтах марудна ідзе падрыхтоўка да абароны доктарскіх дысертацый. Неаднаразова папракаўся за гэта біялагічны факультэт. Цяпер гэты факультэт мае ўсе падставы для павышэння навуковага ўзроўню выкладчыкаў. Тут працуюць 13 прафесараў. Аднак добрыя ўмовы выкарыстоўваюцца не поўнасцю. Можна адзначыць толькі рост колькасці кандыдатаў біялагічных навук, а лік дактароў у апошнія гады не павялічваецца. Многія супрацоўнікі вядуць работу над доктарскімі дысертацыямі (А. Т. Пікулеў, А. В. Канстанцінаў, О. І. Калешка, К. І. Грышан, П. Р. Пятровіч, В. П. Ляхновіч), аднак план прадстаўлення дысертацый не выконваецца.

Дрэнныя справы з падрыхтоўкай дысертацый на хімічным, геаграфічным, матэматычным, факультэце журналістыкі.

Ёсць пэўныя поспехі ў рабоце студэнцкага навуковага таварыства. Павялічылася колькасць членаў СНТ, вырасла колькасць навуковых гурткоў (цяпер іх 72), прыкметна палепшылася работа студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі. У рэспубліканскіх аглядах студэнцкіх навукова-даследчых работ удзельнічала 268 чалавек. 89 студэнцкіх работ аднесены да першай катэгорыі. Каб яшчэ больш палепшыць работу СНТ, неабходна забяспечыць яго фінансіраванне і выдзеліць студэнцкаму навуковаму таварыству хоць бы невялікае памяшканне.

### КІРАЎНІЦТВА ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТАЙ

Улічваючы, што павышэнне ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню лекцый залежыць ад ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладчыка, у справаздачным перыядзе асаблівая ўвага была ўдзелена ідэйна-палітычнаму выхаванню выкладчыцкага саставу. Ва універсітэце створана строгая сістэма палітычнай вучобы, працавалі тэарэтычныя семінары. Працуюць тэарэтычныя семінары па вывучэнню філасофскіх праблем, палітычнай эканоміі, міжнародных адносін, нацыянальна-вызваленчага руху. Праводзяцца палітінфармацыі па пытаннях міжнароднай і ўнутранай палітыкі.

Па ініцыятыве парткома на большасці факультэтаў адбыліся канферэнцыі выкладчыкаў на тэму «Навучанне і выхаванне — адзіны, непарыўны працэс». Добра прайшла такая канферэнцыя на філфаку. Тут з цікавымі дакладамі па пытаннях фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду ў вывучэнні мовы і літаратуры выступілі прафесары тт. Булахаў, Шакун, Ларчанка, Жураў, дацэнты Цімафеева, Кахно.

Партком вывучыў пытанне, як кафедры здзяйсняюць кантроль за ідэйным узроўнем лекцый. Адзначана, што на большасці кафедр чытаюцца лекцыі і праводзяцца залікі на належным тэарэтычным узроўні.

Многія выкладчыкі праводзяць вялікую ідэйна-выхаваўчую работу ў пазалекцыйны час. Лепшымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца кафедры грамадскіх навук, фізічнай геаграфіі зарубежных краін (загадчык В. Р. Заўрыеў), тэорыі і практыкі савецкага друку (загадчык М. Я. Цікоцкі), эканамічнай геаграфіі (І. І. Трухан), фізічнай і калоіднай хіміі (А. А. Вечар), матаналізу (Ф. Д. Гахаў). Аднак некаторыя кафедры дрэнна займаюцца палітыка-выхаваўчай работай сярод студэнтаў. Гэта перш за ўсё адносіцца да кафедр алгебры, ядзернай фізікі, мікрабіялогіі і некаторых іншых.

Вялікую ўвагу ўдзяліў партком павышэнню якасці выкладання грамадскіх навук. Увайшлі ў традыцыю на кафедрах грамадскіх навук адкрытыя лекцыі і семінарскія заняткі, абмеркаванне асобных лекцый, узаеманаведванне лекцый і семінарскіх заняткаў. У выкладанні сталі шырэй прымяняцца наглядныя дапаможнікі і тэхнічныя сродкі навучання. Узрасла зацікаўленасць студэнтаў да грамадскіх навук. Так, у апошнюю сесію на экзаменах 60 працэнтаў студэнтаў атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі. 320 студэнтаў прынялі ўдзел у ІІ Усесаюзным конкурсе студэнцкіх навуковых работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. 37 лепшых работ прадстаўлены на ўсесаюзны конкурс. Аўтары трох з іх атрымалі званні лаўрэатаў і медалі конкурсу, 20 работ адзначаны граматамі і падзякамі. Цяпер ідзе падрыхтоўка да новага конкурсу, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Праводзячы палітыка-выхаваўчую работу ў пазалекцыйны час, дэканаты, партбюро кіраваліся задачамі падрыхтоўкі да Ленінскага юбілею. На факультэтах і ў інтэрнатах праводзяцца ленінскія чытанні, арганізаваны цыклы лекцый аб барацьбе партыі за выкананне ленінскіх запаветаў, раскрываецца значэнне марксізма-ленінізма, сусветна-гістарычная роля У. І. Леніна і інш. Важнае месца ў падрыхтоўцы да юбілею Ільіча займаюць такія формы выхаваўчай работы сярод студэнтаў, як сустрэчы з прадстаўнікамі ленінскай гвардыі, актыўнымі ўдзельнікамі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, героямі першых пяцігодак, ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, паходы па месцах баявой і рэвалюцыйнай славы, сустрэчы з наватарамі вытворчасці.

Вялікая ўвага ўдзялялася таксама і ваенна-патрыятычнаму выхаванню.

Сакратар парткома Т. Я. Дударава расказала аб недахопах у ідэйна-выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў, слабым кантролі за выкананнем планаў ідэйна-выхаваўчай работы з боку парткома і партыйных бюро.

Дакладчык асвятліла стан выхаваўчай работы ў інтэрнатах, кіраўніцтва насценным друкам, мастацкай самадзейнасцю, ідэалагічным выхаваннем супрацоўнікаў універсітэта.

Гаворачы аб ідэалагічнай рабоце, Т. Я. Дударава прывяла цікавыя лічбы і факты. Больш 500 выкладчыкаў і 400 студэнтаў сістэматычна чытаюць лекцыі для працоўных, многія з'яўляюцца прапагандыстамі. Актыўна ўдзельнічаюць у ідэалагічнай рабоце кафедры гісторыі КПСС, філасофіі, навуковага камунізма, палітэканоміі. Вельмі часта выступаюць з лекцыямі тт. Сікорскі, Навіцкі, Жураў, Філімонаў, Русанава, Сцяпанаў, Левін, Гусеў, Цакунова, Дарогін, Ануфрыеў, Рамашка, Галаўко, Піпчанка, Аранскі, Сідэрка і іншыя. Сіламі універсітэцкага калектыву арганізаваны ленінскія чытанні на аўтазаводзе, у Оперным тэатры, Палацы прафсаюзаў. Рыхтуюцца тэарэтычныя канферэнцыі ў сувязі са 100-годдзем з дня на-

# ТВАЯ ЗАДАЧА, КАМУНІСТ

## ВЫСТУПЛЕННЯЎ КАМУНІСТАЎ НА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫМ ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ

раджэння У. І. Леніна ў Жодзіна, Чэрвені.

Аднак не дабіліся яшчэ такога становішча, каб у лекцыйнай рабоце актыўна ўдзельнічалі ўсе выкладчыкі прыродазнаўчых факультэтаў.

Выступаючы ў спрэчках, дацэнт С. Д. ЛАПЦЕНАК гаварыў аб ролі і месцы куратара ў студэнцкай групе. Ён адзначыў, што гэтаму пытанню партком удзяляў многа ўвагі. Правяралася выхаваўчая работа на радзе факультэтаў, а матэрыялы па выніках праверкі асвятляліся ў шматтыражнай газеце.

— У нас на гістфаку куратарамі працуюць вядучыя выкладчыкі—прафесары, дацэнты. Вопыт маёй работы як куратара паказвае, што формы ўздзеяння шматгранныя і разнастайныя. На малодшых курсах патрэбна згуртоўваць калектыў, навучыць працаваць з кнігай, канспектам. Я працую куратарам у групе філосафаў ужо чацвёрты год. За гэты час студэнты не мелі ніводнай здавальняючай адзнакі. Сярэдні бал групы—4,5.

Далей С. Д. Лапцёнак расказаў аб сацыялагічных даследаваннях, у якія ўваходзіла праблема псіхалагічнай сумяшчальнасці цяжкасцей, што ўзнікаюць перад былым выпускніком школы, калі ён прыходзіць у вну. Вынікі даследаванняў былі абагульнены і цяпер выкарыстоўваюцца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Студэнтам куратар патрэбен не ўсякі, сказаў у заключэнне С. Д. Лапцёнак, а толькі такі, які можа з душой працаваць у калектыве.

Ваенна-патрыятычнае выхаванне студэнтаў праводзіцца ў адпаведнасці з перспектыўным планам, зацверджаным рэктаратам, парткомам і планам ваеннай кафедры, расказвае І. В. МАРЧАНКА.

Вялікую дапамогу аказвае палітычнае ўпраўленне акругі. Рэгулярна праводзяцца сустрэчы студэнтаў з ветэранамі, з выпускнікамі універсітэта, якія праходзілі службу ў радах Савецкай Арміі.

Для студэнтаў арганізуюцца экскурсіі ў воінскія часці, па месцах баёў Савецкай Арміі, праводзяцца абаронныя актывы, прачытана 700 лекцый па ваенна-патрыятычнай тэматыцы. Працуюць гурткі па падрыхтоўцы стралкоў, парашутыстаў, радыётэлеграфістаў, вадзіцеляў аўтамашын і матацыклаў. Цяпер вялікая ўвага ўдзяляецца рабоце ДТСААФ.

Але ваенная кафедра ў цяжкім становішчы па захаванню тэхнікі. Сур'ёзныя ўскладненні ўзнікаюць у сувязі са стралковай падрыхтоўкай. Цір, які мы маем, не дазваляе рыхтаваць стралкоў І і ІІ разрадаў.

Неабходна разгледзець пытанне аб размяшчэнні тэхнікі і будаўніцтве ціра.

Камісія, якая правярала ваенную кафедру ў кастрычніку, дала высокую ацэнку ваенна-патрыятычнай рабоце, адзначыла вялікую дапамогу рэктарата і партыйнага камітэта па паляпшэнню навучальнага працэсу і ў правядзенні ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі.

Камуністы ваеннай кафедры прыкладуць усе сілы, каб з гонарам выканаць задачы, якія стаяць перад калектывам.

П. Л. САЛАЎ, сакратар партбюро фізічнага факультэта, сказаў:

— У дакладзе ў добрым выглядзе паказан фізічны факультэт. Гэта вялікая заслуга выкладчыкаў, камуністаў факультэта. У нас ёсць добрыя паказчыкі падрыхтоўкі кадраў, у акадэмічнай і навуковай рабоце. Выкананне гаспадарча-дагаворных работ дае нам магчымасць закупіць каштоўнае сучаснае абсталяванне і весці падрыхтоўку кадраў, якія задавальняюць усе запатрабаванні тэхнічнага прагрэсу. У апошнія 3 гады на кафедрах абараняецца па 12—15 дысертацый. Аднак пры хуткім росце факультэта стварыліся вельмі складаныя ўмовы для работы. На факультэце 13 патокаў (па 100—150 чалавек) і ўсяго дзве паточныя аўдыторыі. Факультэт займаецца ў 4 змены, і цаной вялікіх намаганняў нам удаецца ажыццяўляць вучэбныя планы.

Цяпер цяжка кіраваць факультэтам па старой сістэме. На факультэце 80 вучэбных груп і 14 кафедр. Ні дэкан, ні яго намеснік не маюць магчымасці дэталёва ведаць становішча ў групах і на курсах: курсы ж у нас па 450 чалавек. Мы лічым неабходным і своечасовым увядзенне на курсах метадыстаў, якія б займаліся ўсімі пытаннямі вучэбнага працэсу на курсе. Такі карысны вопыт ёсць у Маскоўскім універсітэце, і яго трэба было б пераняць. Факультэт выйшаў на рубеж вну, і пытанні кіраўніцтва ім трэба вырашаць інакш.

П. Л. Салаў звярнуў увагу на маруднае вырашэнне жыллёвай праблемы, прапанаваў абмеркаваць магчымасць будаўніцтва жылога дома за кошт гаспадарча-дагаворных сродкаў.

А. А. ВОЛК адзначыў, што камуністы філфака, супрацоўнікі і студэнты за справаздачны перыяд зрабілі вялікую работу. Асноўная ўвага была накіравана на паляпшэнне навучальнага працэсу. І ў многім дабіліся поспехаў: удасканалены вучэбныя планы, праграмы. Звыш 350 пячатных лістоў склала навуковая прадукцыя факультэта. За справаздачны перыяд на філфаку былі праведзены саюзныя і рэспубліканскія канферэнцыі і сімпозіумы па навуковых праблемах. Многія выкладчыкі абаранілі доктарскія і кандыдацкія дысертацыі.

Кафедры філалагічнага факультэта ўключыліся ў ленінскія чытанні ў горадзе Мінску і сёлах рэспублікі.

Трэба адзначыць, гаворыць, А. А. Волк, што журфаку і філфаку ўдзяляецца мала ўвагі. У нас 1554 студэнты, 574 займаецца на вячэрнім аддзяленні—18 акадэмічных груп. Даводзіцца праяўляць нямала вынаходніцтва, каб размясціць іх на займаемай намі плошчы. Бывалі выпадкі, калі адначасова 2—3 групы займаліся ў актавай зале. Не створаны належныя ўмовы і для калектыву выкладчыкаў, які налічвае 120 чалавек.

Цяпер наша надзённая задача—стварыць неабходныя ўмовы для вучэбнай работы.

Трэба падумаць і аб інтэрнаце для студэнтаў. Так, на першым курсе беларускага аддзялення займаецца 150 чалавек з розных раёнаў Беларусі, а месц прадастаўлена толькі 28.

Сакратар партбюро матэматычнага факультэта А. П. РАБУШКА звярнуў увагу на неабходнасць лепш ведаць кожнага студэнта. Аднак пры цяперашніх умовах, калі факультэт значна вырас, стала больш складана ажыццяўляць пастаянны індывідуальны кантроль.

А. П. Рабушка прапануе пашырыць асабістую справу студэнта і ў асобны аркуш заносіць звесткі аб паводзінах студэнта, аб яго характэрных рысах. Трэба было б увесці пасаду інспектара па курсах, які б адказваў за гэтую работу.

Прафесар А. П. КЕСАРАВА прысвяціла сваё выступленне навукова-даследчай рабоце студэнтаў. Яна расказала аб формах прыцягнення моладзі да навуковых даследаванняў, арганізацыі работы навуковых гурткоў, адзначыла станоўчыя і слабыя бакі конкурсаў студэнцкіх навуковых работ.

Вялікае значэнне мае гласнасць навуковых дасягненняў, і таму карысна было б, як адзначыла тав. Кесарава, праводзіць агляды навуковых прац у студэнцкім асяроддзі. Вялікі плён могуць прынесці канферэнцыі, падрыхтаваныя кафедрамі розных вну.

Старшыня мясцкома А. А. ГАЛАЎКО ў сваім выступленні гаварыў аб дысцыпліне камуністаў. Ён адзначыў, што без яе не можа існаваць ніводная арганізацыя, тым больш партыйная. Але ў нас у гэтых адносінах, на жаль, не ўсё ў парадку. Парткому ў паўсядзённай працы дапамагае толькі пэўная частка камуністаў, а астатнія недастаткова актыўна ўключаюцца ў грамадскую работу.

Нам трэба дабіцца, каб партыйныя даручэнні меў кожны камуніст. Мне здаецца, гаворыць А. А. Галаўко, што на кафедрах грамадскіх навук таксама не ўсё здавальняюча з размеркаваннем нагрузак.

Ва універсітэце праходзіць грамадскі агляд да культуры вытворчасці, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Але работа гэта на некаторых факультэтах праводзіцца пры нізкай актыўнасці супрацоўнікаў.

Далей А. А. Галаўко гаварыў аб тым, што ва універсітэце мала вучаць, як трэба працаваць з людзьмі. Ён адзначыў, што на ўсіх факультэтах мэтазгодна ўвесці курс па асновах кіравання. Гэта справа карысная і неабходная.

Новаму саставу парткома, сказаў А. А. Галаўко, неабходна сур'ёзна заняцца і пытаннямі быту як у інтэрнатах, так і ў вучэбных карпусах. Ужо пара ад слоў перайсці да справы.

Мясцком і партком многа прыкладаюць сіл, каб забяспечыць супрацоўнікаў і студэнтаў неабходным жыллём. Але ў гэтым пытанні ў нас ёсць шмат перашкод. Адна з іх — гэта тое, што універсітэту выдзяляецца мала жыллёвай плошчы ў маштабах горада. Быту нашых выкладчыкаў, якія вядуць вялікую вучэбную і выхаваўчую работу сярод студэнтаў, трэба ўдзяляць як мага больш увагі.

У апошні час значна ўзмацнілася партыйнае кіраўніцтва камсамолам. Як паведаміў сакратар камітэта камсамола В. І. ПРАКОШЫН, цяпер больш чым у два разы павялічылася колькасць камуністаў, якія непасрэдна вядуць камсамольскую работу. У сваю чаргу лепшыя з лепшых камсамольскіх актывістаў папоўнілі рады партыйнай арганізацыі універсітэта. Добра дапамагаюць камітэту партком, партыйныя бюро факультэтаў, кафедры грамадскіх навук.

Зараз перад камсамольскай арганізацыяй стаяць адказныя задачы: правядзенне ленінскага заліку, паляпшэнне вучэбных спраў, выкананне пастаноў ЦК ВЛКСМ аб дапамозе сельскай школе і падрыхтоўцы да ваенна-тэхнічнага экзамена.

— Мы згодны з тымі заўвагамі, якія былі зроблены ў дакладзе, –гаворыць В. І. Пракошын, — і будзем ліквідоўваць недахопы.

Сустрэць Ленінскі юбілей не толькі вучэбнымі поспехамі, але і добрай арганізацыяй быту студэнтаў — да гэтага заклікала камуністаў Н. С. ГАЛІНА, камендант інтэрната № 1.

Гэты інтэрнат лепшы ва універсітэце. І камуніст Н. С. Галіна расказала, як калектыў заваёўваў перамогу ў спаборніцтве, як ствараліся належныя ўмовы для вучобы і адпачынку студэнтаў.

Індывідуальны падыход, уважлівыя, сардэчныя і ў той жа час патрабавальныя адносіны да моладзі ў многім вызначаюць поспех выхаваўчай работы. У інтэрнаце праведзены конкурсы на лепшы пакой. Цікава арганізаван адпачынак студэнтаў, наладжваюцца гутаркі, вечары пытанняў і адказаў з выкладчыкамі за круглым сталом.

Калектыў інтэрната прыкладзе ўсе сілы, заверыла Н. С. Галіна, каб дастойна сустрэць слаўны юбілей У. І. Леніна.

Сакратар партбюро хімфака М. П. ГІЛЕВІЧ звярнуў увагу камуністаў на тыя цяжкасці, якія ўзніклі перад калектывам хімічнага факультэта.

— Нам пабудавалі выдатны корпус, — гаворыць М. П. Гілевіч выказаў што ён прыносіць адны непрыемнасці.

У будынку няма тэхнічнага току, не працуе вентыляцыя, вада бывае з перабоямі. У такіх умовах немагчыма праводзіць лабараторныя работы, а гэта прыводзіць да зрыву вучэбнага плана.

Неўладкаванасць адмоўна ўплывае і на падрыхтоўку камсамольцаў да ленінскага заліку.

М. П. Гілевіч выказаў просьбу ўсяго калектыву факультэта аб хутчэйшай ліквідацыі непаладкаў у новым корпусе.

Аб неабходнасці больш цеснай сувязі з вытворчасцю, пашырэнні гаспадарча-дагаворнай тэматыкі на біялагічным, матэматычным і іншых факультэтах гаварыў рэктар універсітэта акадэмік А. Н. СЕЎЧАНКА.

Год 1969 адказны, падкрэсліў А. Н. Сеўчанка, і дэканы, загадчыкі кафедр, камуністы павінны аб гэтым памятаць і ўсямерна развіваць супрацоўніцтва з вытворчымі арганізацыямі. хутчэй укараняць у жыццё дасягненні навукі.

А. Н. Сеўчанка расказаў аб перспектывах пашырэння вучэбных плошчаў, будаўніцтва студэнцкіх інтэрнатаў і жылых дамоў для выкладчыкаў. Да 50-годдзя універсітэта намечана прадаставіць кватэры ўсім супрацоўнікам, якія жывуць у інтэрнатах.

У сваім выступленні загадчык аддзела навукі і вышэйшых навучальных устаноў ЦК КПБ А. Ц. КАРАТКЕВІЧ, гаворачы аб дасягненнях універсітэта ў распрацоўцы гаспадарча-дагаворнай тэматыкі, адзначыў, што вядуць гэтыя работы ў асноўным толькі фізічны, хімічны факультэты і вылічальны цэнтр. Астатнія факультэты і многія кафедры не вядуць гаспадарча-дагаворнай тэматыкі.

Цяпер, з уводам у эксплуатацыю новага корпуса, гэтую работу трэба значна пашырыць на хімічным, матэматычным, біялагічным, геаграфічным факультэтах.

Мала ўвагі ўдзяляецца вызначэнню эканамічнай эфектыўнасці закончаных ва універсітэце і ўкаранёных у народную гаспадарку навукова-даследчых работ. Сярод гаспадарча-дагаворных работ шмат дробных і вельмі прыкладных тэм, якія не патрабуюць сур'ёзных тэарэтычных даследаванняў.

На жаль, мы павінны канстатаваць, гаворыць А. Ц. Караткевіч, што ў рабоце партыйнай арганізацыі і рэктарата універсітэта, факультэтаў і кафедр усё яшчэ маецца шэраг сур'ёзных недахопаў. Мала ўкараняецца ў вытворчасць закончаных работ, многія гаспадарча-дагаворныя работы выконваюцца для прадпрыемстваў, якія знаходзяцца за межамі нашай рэспублікі. Прамысловыя прадпрыемствы рэспублікі недастаткова інфармаваны аб навуковай дзейнасці універсітэта. Наша рэспубліка стала краем вялікай хіміі, і мы можам чакаць большага ад нашых вучоных-хімікаў. Вучоныя-біёлагі ўсё яшчэ мала праводзяць навуковых даследаванняў па праблемах, вылучаемых прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, задачамі асвойвання Палескай нізіны.

Партыйнаму камітэту, усім камуністам, зазначыў тав. Караткевіч, неабходна паўсядзённа, сістэматычна ўдзяляць увагу і пытанням быту студэнтаў. У інтэрнатах яшчэ шмат недахопаў: у пакоях бывае брудна і няўтульна, не хапае мэблі, няякасна вядзецца рамонт.

У некаторых пакоях інтэрнатаў няма радыёрэпрадуктараў. Нават у ленінскіх пакоях няма тэлевізараў, у пакоях самападрыхтоўкі студэнтаў адсутнічаюць бібліятэчкі даведнічкай літаратуры.

У заключным слове сакратар парткома Т. Я. ДУДАРАВА сказала, што ўсе крытычныя заўвагі ў адрас парткома справядлівыя. Гэта сведчыць аб зацікаўленасці камуністаў у паляпшэнні работы партыйнай арганізацыі.

Сход прызнаў работу парткома здавальняючай.

Выбран новы састаў партыйнага камітэта. У яго ўвайшлі К. Я. ВІНАКУРАЎ, А. А. ГАЛАЎКО, М. К. ГАРБАЧОЎ. М. С. ГАРАШЧУК, Т. Я. ДУДАРАВА, М. І. ІОСЬКА, С. В. КАЛІШЭВІЧ, І. В. МАРЧАНКА, Р. А. МАЛЮКОВІЧ, І. Я. НАВУМЕНКА, Т. І. ПРЫТЫЦКАЯ, В. І. ПРАКОШЫН, Г. Я. РЫЛЮК, А. Н. СЕЎЧАНКА, В. М. СІКОРСКІ, Е. Н. ТАГУНОЎ. М. Я. ЦІКОЦКІ, М. Д. ЦІВА, І. Р. ЦІШЧАНКА. Сакратаром парткома выбран М. К. ГАРБАЧОЎ, намеснікам—Г. Я. РЫЛЮК.

## ФІЗІКІ ЗАПАЛІЛІ «АГЕНЬЧЫК»

Люба Шпакоўская і Таня Фёдарава ў апошні раз уважліва аглядаюць залу. Усё загадзя прадумана, падрыхтавана, абмеркавана, цяпер застаецца толькі сустрэць гасцей студэнцкага «Агеньчыка».

Хутка зала напаўняецца гоманам. Агульную ўвагу прыцягвае група вучоных і выкладчыкаў, якія толькі што ўвайшлі і адразу апынуліся ў цесным коле моладзі.

Але тут гучыць прыемны дзявочы голас і прымушае ўсіх прыціхнуць: «Добры вечар, дарагія сябры! На наш «Агеньчык» запрошаны выкладчыкі і студэнты фізічнага факультэта, вучоныя сталіцы. «Агеньчык» мы будзем праводзіць у выглядзе гаворачай газеты, і, як у кожнай з іх, у нас таксама ёсць перадавіца. Слова даецца Андрэю Капітонавічу Красіну, дырэктару Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР, лаўрэату Ленінскай прэміі.

Андрэй Капітонавіч падыходзіць да мікрафона. Паддаючыся агульнаму настрою, расказвае проста, як сваім добрым знаёмым, аб днях юнацтва, студэнцкага жыцця і зменах, якія адбыліся з таго часу.

Падзякаваўшы паважанаму госцю, Люба чытае жартаўлівыя парады экзаменуемаму і экзаменатару, што выклікае ўсмешкі студэнтаў.

Пасля аб'яўляецца музычны антракт. Павольна рухаюцца пары. Таня з мікрафонам у руках з гумарам каменціруе танец. За столікамі ідзе ажыўленая гутарка. Дзяўчына-афіцыянтка прапануе каву.

У той вечар прысутныя слухалі яшчэ цікавыя расказы акадэміка АН БССР М. А. Ельяшэвіча, выкладчыкаў М. С. Гарашчука, В. А. Баркана.

Карысная і цікавая была задума студэнтаў-фізікаў.

Н. САЛУК.

ДА 100-ГОДДЗЯ У. І. ЛЕНІНА

# НОВЫЯ ПАСТУПЛЕННІ Ў БІБЛІЯТЭКУ БДУ

Ленин, В. И. Полное собрание сочинений. т. 28. М., Политиздат, 1969. т. 28. Тетради по империализму. 1969. 838 стр.

Ленин, В. И. О временном революционном правительстве. М., Политиздат, 1968, 23 стр.

Ленин, В. И. Об идеологической работе. [Сборник]. 2-е дополн. изд. М., Политиздат, 1969. 446 стр. с иллюстр.

Алексеев, А. Г. Учение В. И. Ленина о пролетарской партии нового типа и современность. Л., 1969. 24 стр.

Багаев, В. А. Ленинское теоретическое наследие. Тюмень, 1969. 31 стр.

Верб, Л. Я. Советуясь с Лениным. [В. И. Ленин о любви, браке и семье]. Л., 1969. 16 стр.

Готт, В. С. Ленинское научное предвидение и современность. М., «Знание», 1969. 95 стр.

Калинин, А. Ф. и Мандель, С. З. Ленин и Петербургский университет. Л., Лениздат, 1969. 271 стр.

Константинов, Н. Н. Ленинское учение о Коммунистической партии и современность. М., 1969, 44 стр.

Копнин, П. В. Философские идеи В. И. Ленина и логика. М., «Наука», 1969. 483 стр.

Кшибеков, Д. и Ким, В. Ленинское учение о государстве. [По материалам работы В. И. Ленина «Марксизм о государстве»]. Алма-Ата, 1969. 30 стр.

В. И. Ленин. Жизнь и деятельность. Библиогр. книг и журнальных статей. М., «Знание», 1969. 63 стр.

В. И. Ленин. Краткий биографический очерк. Изд. 6-е. М., Политиздат, 1969. 224 стр.

Ленин и молодежь. [Материалы научно-практической конференции]. Ульяновск, 1969. 197 стр.

Макарова, Г. П. Осуществление ленинской национальной политики в первые годы Советской власти [1917—1920 гг.]. М., «Наука», 1969. 268 стр.

Письма В. И. Ленину из-за рубежа. [Предисловие В. В. Аникеева, стр. 5—26. Изд. 2-е, дополн.], М, «Мысль», 1969. 470 стр.

Ставицкий, И. В. В. И. Ленин во главе защиты социалистического Отечества. М., «Знание», 1969. 32 стр.

Травин, В. И. В. И. Ленин о социалистическом соревновании и техническом прогрессе. Л., 1969. 20 стр.

Трифонов, И. Я. В. И. Ленин и борьба с буржуазной идеологией в начале НЭПа. М., «Знание», 1969. 48 стр.

Федоров, А. В. Ленинская теория социалистической революции. М., «Высшая школа», 1969. 75 стр.

Шевелев, А. Г. В. И. Ленин о характере современной эпохи. [Методическое пособие в помощь лектору]. Л., 1969. 18 стр.

Шмидт, А. О книге В. И. Ленина «Детская болезнь «левизны» в коммунизме». [Конспект лекции]. Таллин, 1969. 53 стр.

СПОРТ

## НА БЛАКІТНЫХ СЦЕЖКАХ

— На старт! Увага!.. І, быццам чарада птушак, спалоханых выстралам стартавага пісталета, пяцёра дзяўчат скочылі ў ваду. Блакітнае люстэрка разляцелася на тысячы бліскучых кавалкаў. Так пачаліся спаборніцтвы па плаванню сярод студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў нашай сталіцы. У гэтай спартыўнай барацьбе прынялі ўдзел майстры спорту, многа першаразраднікаў. І гэта не выпадкова. Плаванне — спорт маладых. Як правіла, у ліку сусветных рэкардсменаў — юнакі і дзяўчаты 17—20-гадовага ўзросту. Таму зразумела і зацікаўленасць моладзі да аднаго з самых прыгожых відаў спорту.

У каманду плыўцоў універсітэта ўваходзяць студэнты розных факультэтаў і курсаў. Ю. Гарадзецкі, П. Мінец, А. Кляпацкі — спартсмены з вялікім стажам. Яны неаднаразова ўключаліся ў састаў зборных каманд таварыстваў і ведамстваў. Добрых вынікаў у спаборніцтвах дабіўся А. Кляпацкі, які пераадолеў 100 метраў батэрфляем за 1 мін. 10,5 сек.

Зараз у плыўцоў падрыхтоўчы перыяд. Заняткі ў зале пераважаюць над практыкаваннямі ў вадзе. Гэта і ёсць адна з прычын таго, што асабліва добрых секунд спартсмены не паказалі. У агульным заліку каманда БДУ заняла трэцяе месца, прапусціўшы наперад калектывы ІФК і МРТІ.

**У. БАРКОЎСКІ,**
**удзельнік спаборніцтваў.**

## НА ШЛЯХУ ДА ФІНАЛУ

З 21 па 26 лістапада ў спартыўных залах нашага універсітэта і МРТІ праходзіла занальнае першынство вну Беларусі па валейболу. З васьмі каманд, якія ўдзельнічалі ў гэтых спаборніцтвах, толькі дзве мужчынскія і дзве жаночыя трапілі ў фінал. Сярод жаночых каманд-прэтэндэнтак на выхад у фінал былі каманды БДУ і інстытута замежных моў. Драматычна склалася гульня паміж гэтымі камандамі. Спартсменкі універсітэта, выйграўшы першую партыю, упэўнена вялі лік і ў другой. Нечакана два ігракі нашай каманды — Тамара Біч (гістфак) і Таня Пшыркова (філфак) атрымалі сур'ёзныя траўмы і не змаглі больш удзельнічаць у гульні. Раўнацэннай замены ім не знайшлося, і тры наступныя партыі нашы дзяўчаты прайгралі.

Аднак і пераможцы і пераможаныя атрымалі права выступаць у фінале першынства вну рэспублікі, якое адбудзецца ў сакавіку наступнага года.

Няўдала склаліся гульні для нашай каманды мужчын. Яна заняла трэцяе месца, прайграўшы камандзе Гомельскага універсітэта і камандзе МРТІ, і ў выніку не трапіла ў фінал.

В. ЯКАНЕН.

# БРЫШ М. І.



29 лістапада заўчасна памёр дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў, кандыдат фізіка-матэматычных навук Мікалай Іванавіч Брыш.

Мікалай Іванавіч нарадзіўся 8 снежня 1924 года ў вёсцы Дашковічы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці. Васемнаццацігадовым юнаком ён становіцца ў рады народных мсціўцаў і актыўна змагаецца супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У 1945 годзе пасля дэмабілізацыі Мікалай Іванавіч экстэрнам здае экзамены за сярэднюю школу і паступае ў Гродзенскі педінстытут. Яшчэ ў студэнцкія гады ён пачаў займацца навукова-даследчай работай, а па заканчэнні педінстытута паступае ў аспірантуру ў Матэматычны інстытут імя В. А. Сцяклова АН СССР па спецыяльнасці дыферэнцыяльныя ураўненні матэматычнай фізікі.

Пасля абароны дысертацыі М. І. Брыш накіроўваецца ў Мінскі педінстытут, дзе працуе спачатку старшым выкладчыкам, а пасля дацэнтам. Адначасова ён удзельнічае ў навуковым жыцці матэматычнага факультэта нашага універсітэта, а ў 1961 годзе пераходзіць на работу ва універсітэт.

Будучы дацэнтам кафедры матэматычнага аналізу, а пасля кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў, ён чытае асноўныя курсы факультэта: матэматычны аналіз, ураўненні матэматычнай фізікі, функцыянальны аналіз і спецкурсы, і ў гэты ж час Мікалай Іванавіч вядзе вялікую навуковую работу па дыферэнцыяльных ураўненнях і функцыянальнаму аналізу. Яго пяру належыць каля 25 навуковых прац.

М. І. Брыш кіраваў вялікай групай аспірантаў і студэнтаў, умела спалучаў плённую навуковую і педагагічную дзейнасць з вялікай адміністрацыйнай і грамадскай работай.

Светлая і добрая памяць аб М. І. Брышу назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.

## ЭЎРЫСТЫКА — ШТО ГЭТА?

«Навука аб натхненні»... Сапраўды, незвычайная назва? Што гэта за навука аб натхненні? Аб гэтым нам расказвае артыкул Віктара Бабровіча, змешчаны ў лістападаўскім нумары часопіса «Полымя».

«Больш за тысячагоддзі таму назад, як кажа паданне, Архімед, выскачыўшы з ванны, паімчаўся па вуліцы сваіх Сіракузаў з воклічам «Эўрыка!»

«Што знайшоў?» — пыталіся гараджане. «Закон», — адказаў вучоны.

«Эўрыка» на ўсіх мовах гучыць без перакладу і азначае найвышэйшую ступень узрушанасці. Чалавецтву спадабалася «Эўрыка». Цяпер, праз 2000 год, ёй наканавана было аформіцца ў навуку і загучаць з кафедр ужо не толькі ў сэнсе «знайшоў», а і ў сэнсе таго, як і дзе знаходзяць тое, што сёння патрэбна людзям, каб аблегчыць жыццё і працу, каб далей адбываўся навукова-тэхнічны прагрэс, развіваліся культура і мастацтва.

Эўрыстыка стала побач з радыёэлектронікай, мікрабіялогіяй, эстэтыкай, літаратуразнаўствам. Гэта навука аб натхненні, навука аб творчым мысленні, аб метадах і правілах, якія дапамагаюць рабіць адкрыцці і вынаходствы, тое, што пасля называюць творчай удачай. Але як узнікае і працякае сам творчы працэс? Якія стымулы ўплываюць на гэта? Высвятленнем гэтых пытанняў і заклікае займацца навука эўрыстыка, якую перш за ўсё цікавіць **творчы працэс.**

Тэорыю творчасці называюць эўрылогіяй (эўрыстыкай). Яе прапанаваў Энгельмейер. У сучасную эпоху эўрыстыка яшчэ толькі нарадзілася, але яна павінна заняць вядучае месца ў жыцці. Эўрыстыка заклікана распрацаваць тэорыю агульнага разумення працэсу мыслення, якое ператвараецца ў непасрэдную прадукцыйную сілу. Яна павінна ўнесці нейкую планавасць і «чарговасць» адкрыццяў і вынаходстваў. Задачы эўрыстыкі — раскрыць заканамернасці, якія звязаны з творчымі вынаходствамі. Вучоныя спрабавалі высветліць агульныя заканамернасці таго, што ўсё ж-такі стварае перадумовы для вырашэння праблем інтуітыўным чынам. Натураліст Гельмгольц, матэматык Пуанкарэ і некаторыя іншыя вучоныя адзначалі, напрыклад, што вырашэнне цяжкай задачы звычайна адбываецца пасля таго, як напружаная праца змяняецца адпачынкам і чалавек пачынае займацца чым-небудзь іншым. У дарозе, у сне ў галаву прыходзяць ідэі, да якіх ніяк не ўдаецца дадумацца за пісьменным сталом. Д. І. Мендзялееў трое сутак без сну працаваў над сваёй табліцай. Ад празмернай стомы заснуў і... «Бачу ў сне табліцу, дзе элементы расстаўлены, як трэба», — успамінаў вучоны. Выпадкова цікаўны Левенгук падсунуў пад лінзу кроплю вады з мікробамі і тым самым «высачыў» нябачных ворагаў чалавека, якія дачасна звялі ў магілу мільёны людзей. Выпадковага жарту Валянціна Катаева было даволі, каб зарадзіцца задуме «12 крэслаў» І. Ільфа і Я. Пятрова. Выпадкова... і гэтак далей. Ці не шмат выпадковасцей? А можа ў кожнай з іх тоіцца заканамернасць? Усё гэта і хвалюе новую навуку. Вядома, за кожным «выпадкам—гады напружанай працы і, як гаварыў французскі матэматык Лагранж: «На выпадак пры ўсякіх адкрыццях натыкаюцца тыя, хто яго заслугоўвае» Эўрыстыка яшчэ пкуль што не можа даць аналізу, як выбіраюцца патрэбныя даныя, каб рашыць творчую праблему, не дае яна канкрэтных парад наконт таго, як усё ж кіраваць працэсам творчасці; што, несумненна, набліжае людзей да гэтай прынаднай мэты. Эўрыстыка — навука аб творчым мысленні — навука XX стагоддзя. Сёння раскрыццё таямніц творчага мыслення робіцца ўсё больш актуальным, бо мяняецца характар працы творчых работнікаў і ўзрастае сацыяльная роля навуковага прадбачання. Эўрыстычныя даследаванні ўжо хутка дазволяць значна павысіць ККД навуковага і тэхнічнага прагрэсу. Сёння эўрыстыка са сваёй методыкай навуковай арганізацыі творчасці заклікае пад свае сцягі энтузіястаў, для якіх вывучэнне таямніц творчасці можа стаць справай усяго жыцця...

Я толькі ў агульных рысах пазнаёміла вас з гэтай навукай. Дакладней і змястоўней можна даведацца аб усім, прачытаўшы артыкул.

**Т. ФІЛІМОНАВА.**



У НОВЫМ УБРАННІ. Фотаэцюд З. Сяргеева.

## ПА СТАРОНКАХ НАВУКОВАЙ ПЕРЫЁДЫКІ

### ГОРАД НАРАДЖАЕ НАВАЛЬНІЦУ

Вялікія гарады нараджаюць свае дажджы і навальніцы, сцвярджае амерыканскі вучоны Стэнлі Шаньон, член камісіі па водных рэсурсах штата Ілінойс. У Чыкага, напрыклад, трэцяя частка ўсіх навальніц, якія ўзнікалі над горадам, выклікана асаблівасцямі мікраклімата: вертыкальны рух паветраных мас пад уплывам цяпла, што выдзяляюць заводы, забруджванне паветра, заслоны, якія ствараюцца высокімі будынкамі.

### «СОНЕЧНЫ» ГАДЗІННІК

Адна амерыканская фірма выпусціла электрычны ручны гадзіннік, які працуе ад сонечнай батарэі. Мініяцюрныя элементы размешчаны на цыферблаце; калі дзень недастаткова яркі, яны падзараджаюцца светам электрычных лямп. Аб гэтай навінцы паведамляе газета «Нью-Йорк таймс».

### РУХАВІК ДЛЯ ПЛЫЎЦОЎ

У Англіі нядаўна была прадэманстравана «машына для плавання», прызначаная для выратавальнікаў на вадзе. Яна дазваляе хутка прыйсці на дапамогу тонучаму, пераадольваючы вадавароты і моцныя цячэнні. Машына мае форму ранца і носіцца за спіной. Гэта двухтактны рухавік з вінтом, які ўстаноўлен такім чынам, што не скоўвае рухаў плыўца; ён запускаецца шнурком, перакінутым праз плячо. Хуткасць рэгуліруецца паваротам рукояткі.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 19079. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 1946. Тыраж 2000 экз.